Панядзелак, 04 Кастрычнік 2021

Аляксандра Шматава асудзілі на два гады «хіміі» за абразу супрацоўніка ДАІ з Ганцавічаў

Друкаваць (/news/sud/item/4201-dva-gady-khimii?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=ae366ee33e1973bb9e6fae4ec6be44af44b9a506)

Ацаніць гэты матэрыял (4 галасоў)



(/media/k2/items/cache/7fa76d838c5d0669d5303aecd98021bb_XL.jpg)

Перад абвяшчэннем прысуду

4 кастрычніка суд Першамайскага раёну Віцебску, разгледзеўшы ў судовым паседжанні крымінальную справу (/news/sud/item/4200-dva-gady-khimii/) 50-гадовага віцябляніна Аляксандра Шматава, прызнаў яго вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем тым службовых абавязкаў (арт. 369 КК). Суд пастанавіў пакараць Шматава двума гадамі абмежавання свабоды з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія»).

У апошнім слове **Аляксандр Шматаў** быў лаканічны. Сказаў, каб суд прызначыў яму мінімальна магчымае пакаранне.

Пасля перапынку суддзя **Наталля Карабліна** абвесціла вырак. На падставе **арт. 369 КК** суд прызначыў Шматаву пакаранне ў выглядзе абмежавання свабоды на тэрмін 2 гады з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Тэрмін адбыцця пакарання будуць вылічваць са дня пастаноўкі на ўлік у папраўчай установе адкрытага тыпу. Тэрмін утрымання пад вартай ад 23 да 26 ліпеня залічаны ў тэрмін адбыцця пакарання з разліку адзін дзень утрымання пад вартай – гэта два дні абмежавання волі.

У адпаведнасці з ч. 1 арт. 46 КК прынята рашэнне прымяніць адмысловую канфіскацыю мабільнага тэлефона Шматава, які стаў сродкам учынення злачынства. Да набыцця прысудам законнай моцы меру стрымання пакінулі ранейшую: падпіска аб нявыездзе.

> Пазоўныя патрабаванні старшага лейтэнанта **Ігара Вольніча** аб кампенсацыі маральнай шкоды суд задаволіў у памеры **1000 рублёў** з заяўленых 1500. У частцы грамадзянскага пазову для добраахвотнага выканання прысуду вызначаны тэрмін у адзін месяц. Арышт, накладзены на маёмасць Шматава, вырашана не адмяняць.

Прысуд можа быць абскарджаны і апратэставаны ў Віцебскім абласным судзе.

Нагадаем, 9 верасня Першамайскі суд па гэтым жа артыкуле, за абразу гэтага самага супрацоўніка ДАІ на старонцы Вольгі Карач у «Аднакласніках» прыгаварыў (/news/sud/item/4161-na-starontsy-volgi-karach) 46-гадовага віцябляніна **Аляксандра Васейкіна** да двух з паловай гадоў «хатняй хіміі». Справы нібы спісаныя пад кальку, але прысуды розныя.

Тую акалічнасць, што Шматаў даглядае 76-гадовую маці, суд пад увагу не ўзяў.

Ян Сведка

Апублікавана ў Суд (/news/sud)
Тэгі: Аляксандр Шматаў (/itemlist/tag/Аляксандр%20Шматаў) Наталья Карабліна (/itemlist/tag/Наталья%20Карабліна) артыкул 369 КК (/itemlist/tag/артыкул%20369%20КК) Вольга Карач (/itemlist/tag/Вольга%20Карач)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Пракурорка запатрабавала два гады «хіміі» для віцябляніна, які абразіў даішніка (/news/sud/item/4200-dva-gady-khimii) Два гады «хіміі» – за кароткае слова «чмо». У Віцебску абвясцілі яшчэ адзін прысуд за абразу міліцыянта Вольніча » (/news/sud/item/4202-za-karotkae-slova-chmo)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/4201-dva-gady-khimii#startOfPageId4201)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https://t.me/Tamilwebseries)